# Прыёмы і сродкі вывучэння знешняй палітыкі СССР

# ПАСЛЯ ДРУГОЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ

**І. І. БАГДАНОВІЧ,**
**кандыдат педагагічных навук**

Вучэбны матэрыял па дадзенай тэме мае вялікія магчымасці для выпрацоўкі ў вучняў партыйна-класавага падыходу да аналізу падзей міжнароднага жыцця, фарміравання ў іх умення супрацьстаяць буржуазнай прапагандзе, пераканаўча паказваць яе беспадстаўнасць, ілжывасць. У адпаведнасці са структурным аналізам і адукацыйна-выхаваўчымі задачамі матэрыялу (гл. Народная асвета, 1984, № 9, с. 57—60) мы імкнуліся вызначыць некаторыя найбольш рацыянальныя прыёмы і сродкі вывучэння, іх аптымальнае выкарыстанне на ўроку.

Рэалізацыі выхаваўчых магчымасцей тэмы ў значнай ступені садзейнічае эмацыянальна-вобразнае знаёмства з важнейшымі фактамі, што дасягаецца шляхам выкарыстання прыёмаў сюжэтнага расказу з элементамі маляўнічага апісання і вобразнай характарыстыкі. Яны, хаця і забяспечваюць толькі эмпірычныя веды, аднак дазваляюць у жывой, вобразнай форме перадаць развіццё, напал падзей, выклікаюць у вучняў асабістыя адносіны да іх, уздзейнічаюць на патрыятычныя, інтэрнацыянальныя і маральныя пачуцці. Істотную дапамогу тут аказвае выкарыстанне такіх сродкаў, як кадры дыяфільмаў, дыяпазітывы, схемы, дыяграмы, графікі, малюнкі, вобразна-эмацыянальныя тэксты мастацкай і навукова-папулярнай літаратуры, перыядычны друк, а таксама фрагменты фільмаў «Вялікі дзень Еўропы» (аб нарадзе па бяспецы і супрацоўніцтву ў Еўропе), «Павуцінне» (аб ідэалагічнай барацьбе імперыялізму супраць СССР), «Надзейная аснова міру» (аб Варшаўскім Дагаворы) і інш. Яны папоўняць веды вучняў, дапамогуць ім паўтарыць і замацаваць матэрыял.

Вялікай сілай эмацыянальнага ўздзеяння на школьнікаў валодаюць вобразы выдатных барацьбітоў за мір. Дзяцей прыцягваюць перш за ўсё іх мужнасць, сіла волі, мэтанакіраванасць, служэнне інтарэсам чалавецтва. У той жа час рэакцыйныя дзеячы, якія вызначаюць імперыялістычную знешнюю палітыку, выклікаюць у вучняў пачуцці пагарды і нянавісці. Уплыў на эмацыянальнае ўспрыманне аказваюць вобразныя характарыстыкі, складзеныя на аснове мастацкіх і публіцыстычных тэкстаў у спалучэнні з нагляднымі сродкамі (партрэтамі, ілюстрацыямі, кадрамі дыяфільмаў, дыяпазітывамі, слайдамі і г. д.).

Напрыклад, пры вывучэнні пытання аб узнікненні Сусветнага руху прыхільнікаў міру можна выкарыстаць наступную характарыстыку першага старшыні Сусветнага Савета Міру Фрэдэрыка Жаліо-Кюры: «У кожнай краіне былі выдатныя барацьбіты за мір. Іх імёны ведалі шырока, і слава пра іх выдатную дзейнасць ішла з краіны ў краіну. Але сярод іх быў чалавек, найбольш папулярны і любімы сярод мільёнаў прыхільнікаў міру. Гэта Фрэдэрык Жаліо-Кюры. Высокі, худы, сціплы ў рухах і жэстах чалавек са спакойным, смуглым, засяроджаным тварам, з уважлівым позіркам па-маладому ззяючых вачэй пры з'яўленні ў зале пасяджэнняў выклікаў хвалю цёплага і непасрэднага ажыўлення. Усякі адчуваў, што гэты вучоны з сусветным іменем, лаўрэат Нобелеўскай і першы ўладальнік Міжнароднай Ленінскай прэміі міру з'яўляецца па праву кіраўніком руху прыхільнікаў міру.

У яго надзвычайная біяграфія. Сын парыжскага камунара, сусветна вядомы вучоны, ён мужна змагаўся супраць фашызму, забяспечваў байцоў Супраціўлення гранатамі, мінамі і іншай зброяй са сваёй лабараторыі, выратаваў ад гітлераўцаў матэрыялы, якія паскорылі б іх доследы па вырабу атамнай зброі. Даследчык мірнага выкарыстання атамнай энергіі, Жаліо-Кюры заўсёды заставаўся сынам свайго народа. Ён стаў на чале новага, невядомага яшчэ па маштабах руху прыхільнікаў міру, не вагаючыся, пайшоў на ўсе выпрабаван-

ні, ведаючы, што супраць яго выступяць і рэакцыянеры, і імперыялісты, і ўсе тыя, для каго прывычна дзейнічаць сілай, пагрозамі, паклёпам.

Выдатны аратар і таленавіты арганізатар, які валодаў усеабдымнымі ведамі і неўтаймоўным духам, горача паўставаў супраць усякай несправядлівасці, ён стаў стратэгам вялікага наступлення соцень мільёнаў людзей супраць вайны» (Жолио-Кюри Фредерик. Пять лет борьбы за мир. М., 1956, с. 4—6).

У спалучэнні з нагляднасцю такая характарыстыка дазваляе сфарміраваць уяўленне аб выдатным барацьбіту за мір, дапамагае глыбей запомніць падзеі, звязаныя з яго дзейнасцю.

Важную ролю ў засваенні знешнепалітычнага матэрыялу, рэалізацыі яго адукацыйна-выхаваўчых магчымасцей маюць і характарыстыкі рэакцыйных дзеячаў, якія імкнуцца ўзнавіць страчаныя імперыялізмам пазіцыі ў свеце, развязаць новую сусветную тэрмаядзерную вайну. Так, разглядаючы пытанне аб пачатку «халоднай вайны», можна прапанаваць вучням складзеную на аснове ўрыўкаў з мастацкай і навукова-папулярнай літаратуры характарыстыку амерыканскага прэзідэнта Г. Трумэна: «Гары Трумэн — невысокі, танкагубы чалавек у акулярах з ледзь прыметнай аправай і ненатуральнай, быццам прыклеенай, усмешкай працвітаючага амерыканца.

Ён нарадзіўся ў сям'і дробнага фермера. Нягледзячы на прыроджаную блізарукасць, шмат чытаў. Першай кнігай, прачытанай ім самастойна, была «Біблія», якую пазней ён вывучыў на памяць і праславіўся набожным чалавекам, прыкладным хрысціянінам.

Адукацыю Трумэн атрымаў у юрыдычным ліцэі. Служыў канторшчыкам. Спрабаваў займацца гандлем, але абанкруціўся. Наогул, ён быў звычайным амерыканцам, які марыў разбагацець і дабіцца ўлады. Не маючы грошай, ён хутка зразумеў, што крывадушнасць у аблічы высокай маральнасці можа стаць капіталам не менш надзейным, чым наяўнасць грошай. З усіх масак, даступных яму, ён выбраў найбольш выгадную для сябе — чалавека сумлення.

Гэтага не змаглі не заўважыць палітычныя босы, якія загразлі ў цынічнай і беспрынцыповай гульні. Яны дабіліся выбрання Трумэна акружным суддзёй штата, а затым, убачыўшы, што ён раўніва абараняе іх інтарэсы, — сенатарам ад гэтага штата. У красавіку 1945 г. пасля смерці Ф. Рузвельта Трумэн стаў прэзідэнтам.

Набожны чалавек і «прыкладны хрысціянін» — ён аддаў загад аб бамбардзіроўцы Хірасімы і Нагасакі, дзе загінулі сотні тысяч ні ў чым не павінных людзей. Менавіта ён распрацоўваў вар'яцкія планы нанясення ядзерных удараў па важнейшых гарадах і прамысловых цэнтрах нашай краіны. Яго палітыка, яго дактрыны на тры дзесяцігоддзі атруцілі міжнародныя адносіны. Ідэі аднаго з найвялікшых злачынцаў чалавецтва зноў ажылі ў Белым доме. Там зноў носяцца з ідэямі ўдушэння сацыялізму, абмежаваных ядзерных і «зоркавых» войнаў» (Чаковский А. Победа. Политический роман. — Роман-газета, 1979, № 14, с. 45—48; Книга для чтения по новейшей истории. 1945—1978 гг. Под ред. Н. Н. Яковлева. — М., 1976, с. 262—267).

Такія характарыстыкі, складзеныя настаўнікам або па яго заданню вучнямі, дазваляюць не толькі добра ўявіць асобу з уласцівымі ёй маральнымі якасцямі, але і прасачыць сувязь з інтарэсамі і патрэбнасцямі класа, якому яна служыць.

Найбольш эфектыўнымі сродкамі вывучэння гісторыка-статыстычнага матэрыялу з'яўляюцца графікі, дыяграмы, табліцы, вучэбная, даведачная і навукова-папулярная літаратура. Гэтым сродкам адпавядаюць наступныя прыёмы: кароткае інфармацыйнае паведамленне, чытанне тэкстаў, дзе змешчаны статыстычны матэрыял, складанне, чытанне і каменціраванне графікаў і дыяграм, каменціраванне табліц. Пералічаныя прыёмы і сродкі забяспечваюць эмпірычнае вывучэнне галоўных фактаў, дапамагаюць фарміраваць у школьнікаў вобразнае мысленне.

Якія ж сродкі і прыёмы фарміравання ў вучняў тэарэтычных ведаў? Тут могуць быць выкарыстаны ўмоўна-графічная нагляднасць, друкаваныя гістарычныя тэксты (падручнік, гістарычныя дакументы, творы класікаў марксізму-ленінізму, дакументы КПСС, перыядычны друк), вучэбныя памяткі, лагічныя схемы ў спалучэнні з адэкватнымі прыёмамі тлумачэння, характарыстыкі, разважання, доказу, аналізу гістарычных тэкстаў, самастойнага вызначэння істотных прымет паняццяў і іх фармулявання, выяўлення прычынна-выніковых сувязей і заканамернасцей развіцця, састаўлення вусных і пісьмовых сэнсавых планаў, тэзісаў, тэкставых табліц, выкарыстання тэарэтычных ведаў для вырашэння праблемных задач.

З прыёмам складання параўнальна-абагульняючай табліцы, пра што, як паказвае практыка, школьнікі маюць вельмі агульнае ўяўленне, можна пазнаёміць на ўроку «Знешняя палітыка СССР і міжнародныя адносіны ў першыя пасляваенныя гады». Настаўнік падкрэслівае, што з утварэннем сусветнай сістэмы сацыялізму ў міжнародных адносінах вельмі яскрава вызначыліся дзве лініі: сацыялістычных дзяржаў — на захаванне і ўмацаванне міру як асноўнай умовы пабудовы сацыялізму і камунізму; імперыялістычных — на падрыхтоўку новай сусветнай вайны, якая павінна знішчыць сацыялізм і забяспечыць непадзельнае панаванне імперыялізму.

Далей настаўнік адзначае, што змест урока дазваляе параўнаць мэты, асноўныя напрамкі, прынцыпы, метады і сродкі ажыццяўлення знешняй палітыкі сацыялістычных і капіталістычных дзяржаў у першыя пасляваенныя гады. Для таго, каб гэта параўнанне было больш наглядным, каб глыбей зразумець і засвоіць сутнасць класавай барацьбы на міжнароднай арэне, на ўроку пад кіраўніцтвам настаўніка складаецца прыкладна такая параўнальна-абагульняючая табліца (гл. с. 55).

На ўроку «Знешняя палітыка СССР у 50-я гады» можна прапанаваць наступнае заданне: пакажыце, як знешнепалітычная дзейнасць Савецкай дзяржавы грунтуецца на ленінскіх прынцыпах пралетарскага інтэрнацыяналізму і мірнага суіснавання. Вучні ўжо пазнаёміліся з сутнасцю прынцыпаў знешняй палітыкі нашай краіны і пры дапамозе настаўніка змогуць вылучыць іх істотныя прыметы. У выніку складаецца наступны сэнсавы план.

I. Пралетарскі інтэрнацыяналізм у знешняй палітыцы СССР.

1. Умацаванне адзінства і згуртаванасці сусветнай сістэмы сацыялізму:

а) пераход у рамках СЭУ да кааперавання і спецыялізацыі вытворчасці, узгадненне народнагаспадарчых планаў;

б) будаўніцтва пры дапамозе СССР у сацыялістычных краінах 400 буйных прамысловых прадпрыемстваў, выдзяленне ім крэдыту на суму 21 млрд. руб.;

в) заключэнне ў маі 1955 г. Варшаўскага Дагавора;

г) дапамога венгерскаму народу ў ліквідацыі контррэвалюцыйнага мяцяжу;

д) зацвярджэнне ў 1959 г. Статута СЭУ.

2. Падтрымка нацыянальна-вызваленчага руху:

а) узвядзенне ў вызваленых дзяржавах пры дапамозе СССР 300 прамысловых аб'ектаў, прадастаўленне ім крэдытаў на суму 3 млрд. руб.

3. Барацьба за згуртаванасць міжнароднага рабочага і камуністычнага руху: удзел у рабоце міжнародных нарад камуністычных і рабочых партый 1957 г. і 1960 г.

II. Прынцып мірнага суіснавання ў знешняй палітыцы СССР.

1. Барацьба за ліквідацыю ачагоў вайны:

а) у Карэі (1950—1953 гг.);

б) скліканне Жэнеўскай канферэнцыі і падпісанне пагадненняў аб спыненні вайны ў Індакітаі (1954 г.);

в) ліквідацыя ў 1956—1958 гг. ваенных ачагоў на Блізкім Усходзе.

2. Вырашэнне спрэчных пытанняў шляхам перагавораў:

а) нарада кіраўнікоў урадаў СССР, ЗША, Англіі і Францыі (1954 г.);

б) прыняцце ААН па ініцыятыве СССР Дэкларацыі аб прынцыпах мірнага суіснавання дзяржаў.

3. Раўнапраўнае і ўзаемавыгаднае супрацоўніцтва паміж дзяржавамі: устанаўленне да канца 50-х гадоў узаемавыгадных гандлёвых адносін паміж 70-ю дзяржавамі свету.

4. Барацьба за спыненне гонкі ўзбраенняў:

а) ліквідацыя ў 1955 г. ваенных баз СССР у Порт-Артуры і Паркала-Ут (Фінляндыя);

б) скарачэнне ў СССР у аднабаковым парадку сваіх Узброеных Сіл і спыненне выпрабаванняў ядзернай зброі.

Работа над планам дазваляе вучням не толькі паспяхова выканаць прапанаванае заданне, але і садзейнічае развіццю ў іх гістарычнага мыслення, павышае пазнавальную актыўнасць і самастойнасць.

Прыём тэзіравання добра выкарыстаць пры азнаямленні школьнікаў з вывадамі XX з'езда КПСС. Іх асэнсаванае засваенне дапаможа зразумець сутнасць сучасных міжнародных адносін. Вучням можна прапанаваць прачытаць тэкст падручніка і фрагмент з *дакументаў XX з'езда партыі* (або адпаведны тэкст з Праграмы КПСС) і даказаць на аснове аналізу сучаснага міжнароднага становішча актуальнасць вывадаў партыйнага форуму. Дзесяцікласнікі складаюць наступныя тэзісы:

1. З'езд указаў, што ў сучасных умовах мірнае суіснаванне з'яўляецца адзіна магчымай формай адносін паміж дзяржавамі, бо любая вайна пры каласальным назапашванні зброі

| Лініі параўнання | Аб'екты параўнання: Сацыялістычная знешняя палітыка | Аб'екты параўнання: Імперыялістычная знешняя палітыка | Агульнае, прыватнае, асаблівае ў істотных прыметах аб'ектаў |
|---|---|---|---|
| I. У чыіх інтарэсах праводзіцца | У інтарэсах працоўных усіх краін, якія зацікаўлены ў міры. Вайна прыносіць ім смерць, разбурэнне, галечу | У інтарэсах буйных манаполій. Вайна, гонка ўзбраенняў—сродкі забеспячэння звышпрыбыткаў | Знешняя палітыка дзяржавы абумоўлена інтарэсамі пануючых у іх класаў |
| II. Асноўная задача знешняй палітыкі | Забяспечыць мірныя ўмовы будаўніцтва сацыялізму і камунізму | Пераадолець крызіс капіталізму, захаваць панаванне ў свеце, магчымасць эксплуатаваць іншыя народы | Мэты знешняй палітыкі абумоўлены характарам грамадскага ўкладу |
| III. Асноўныя напрамкі знешняй палітыкі | 1. Барацьба за ўмацаванне сусветнай сістэмы сацыялізму:<br>— дапамога краінам народнай дэмакратыі ў будаўніцтве асноў сацыялізму;<br>— падпісанне двухбаковых дагавораў аб дружбе і супрацоўніцтве паміж СССР і іншымі сацыялістычнымі краінамі;<br>— стварэнне Савета Эканамічнай Узаемадапамогі (1949 г.);<br>— ліквідацыя ядзернай манаполіі ЗША;<br>— утварэнне ГДР<br><br>2. Падтрымка нацыянальна-вызваленчага руху: аказанне дапамогі народам Індакітая, Інданезіі і іншых дзяржаў у барацьбе за незалежнасць<br>3. Умацаванне адзінства ўсіх міралюбівых сіл:<br>— узнікненне ў 1949 г. сусветнага руху прыхільнікаў міру;<br>— прыняцце ў СССР закона «Аб ахове міру» (1951 г.) | 1. Знішчэнне або аслабленне сусветнай сістэмы сацыялізму:<br>— спроба навязаць кабальныя мірныя дагаворы краінам Усходняй Еўропы;<br>— пачатак «халоднай вайны» — «дактрына Трумэна», «план Маршала»: у абмен на эканамічную дапамогу «маршалізаваныя» краіны ўцягваліся ў эканамічную блакаду сацыялістычных краін і ваенныя блокі;<br>— утварэнне ФРГ;<br>— стварэнне НАТО<br><br>2. Барацьба супраць нацыянальна-вызваленчага руху: агрэсія імперыялізму ў Індакітаі і Інданезіі<br><br>3. Аслабленне камуністычнага і рабочага руху:<br>— антыкамуністычная істэрыя, антырабочае заканадаўства ў ЗША;<br>— спроба не дапусціць стварэння руху прыхільнікаў міру | Асноўныя напрамкі знешняй палітыкі сацыялістычных дзяржаў адлюстроўваюць яе міралюбівы характар. Напрамкі імперыялістычнай знешняй палітыкі адлюстроўваюць яе карэнную супрацьлегласць знешняй палітыцы сацыялізму. Асноўныя напрамкі знешняй палітыкі дзяржавы адпавядаюць карэнным інтарэсам пануючага ў іх класа |
| IV. Прынцыпы, метады і сродкі | Мірнае суіснаванне і пралетарскі інтэрнацыяналізм:<br>— дапамога народу Чэхаславакіі харчаваннем у 1946 г.;<br>— падпісанне дагавору аб дружбе і супрацоўніцтве паміж СССР і Фінляндыяй (1948 г.);<br>— прапанова СССР у ААН аб ліквідацыі ядзернай зброі (1947 г.) | Эканамічны, палітычны і ваенны націск (шантаж, подкуп, загаворы, войны);<br>— атамны шантаж на Парыжскіх мірных перагаворах;<br>— «дактрына Трумэна» і «план Маршала»;<br><br>— забарона на ўезд дэлегацыі сацыялістычных краін на I Кангрэс прыхільнікаў міру ў Парыжы;<br>— антырабочае заканадаўства ў ЗША | Прынцыпы, метады і сродкі ажыццяўлення знешняй палітыкі абумоўлены яе класавай сутнасцю |

масавага знішчэння можа прывесці да ўзнікнення сусветнага тэрмаядзернага канфлікту.

2. З'езд канкрэтызаваў ідэю мірнага суіснавання і ўказаў, што яно з'яўляецца спецыфічнай формай класавай барацьбы і не распаўсюджваецца на галіну ідэалогіі.

3. На з'ездзе быў зроблены вывад аб магчымасці прадухілення вайны ў сучасных умовах.

Такім чынам, пры вывучэнні знешнепалітычнага матэрыялу выкарыстоўваюцца разнастайныя метадычныя прыёмы і сродкі, якія садзейнічаюць фарміраванню ў вучняў марксісцка-ленінскага падыходу да вывучэння гісторыі, з'яўляюцца важнай умовай актывізацыі пазнавальнай дзейнасці.





Мінскаму ПТВ № 24 будаўнікоў у мінулым годзе споўнілася 60 гадоў. За гэты час вучылішча падрыхтавала каля 20 тыс. высокакваліфікаваных рабочых. Тут можна атрымаць спецыяльнасці цесляра, сталяра, маляра-тынкоўшчыка, машыніста маставых і казловых кранаў, муляра-мантажніка і інш. Акрамя таго, у вучылішчы створаны ўсе ўмовы для атрымання сярэдняй адукацыі.

На здымках: у кабінеце чарчэння праводзіць заняткі Святлана Яфімаўна Паўлючук; майстар вытворчага навучання Іван Уладзіміравіч Жолудзь з навучэнцамі ў сталярным цэху.

Фота П. НІКІЦІНА.